Далёка — блізка

«НАВОШТА МАКІЯЖ, КАЛІ З ДОМУ МОЖНА ВЫЙСЦІ ТОЛЬКІ Ў МАСЦЫ І АКУЛЯРАХ?»

Беларуска расказала, як жыве на каранціне ў Тэль-Авіве

Ва ўсім свеце працягваецца барацьба з каранавірусам — дзясяткі дзяржаў закрылі свае граніцы і мінімізавалі ўнутраныя перамяшчэнні, а грамадзян, установы і прадпрыемствы адправілі на каранцін. Гэтыя меры закранулі і многіх беларусаў, якія цяпер жывуць і працуюць у іншых краінах. Пра тое, як вытрымаць самаізаляцыю далёка ад радзімы, якім чынам артысты і слухачы падтрымліваюць адно аднаго анлайн і пад якую мелодыю лепш за ўсё мыць рукі, «Звязда» распытала беларускую спявачку, лаўрэатку міжнародных музычных конкурсаў Марыну ВАСІЛЕЎСКУЮ, якая ўжо месяц знаходзіцца на каранціне ў Ізраілі.

— Я прыехала сюды летась на гастролі, і яны аказаліся даўжэйшыя, чым планавала, — расказвае спявачка. — Наогул мінулы год стаў вельмі плённым — шмат знаёмстваў з музыкантамі, кампазітарамі, творчай інтэлігенцыяй. Жыву ў Тэль-Авіве, выступаю з канцэртамі ў розных гарадах, супрацоўнічаю з аркестрамі, джаз-бэндамі, з тутэйшымі кампазітарамі запісалі шмат песень, зрабілі розныя тэматычныя праграмы. Тут многа рускамоўнай публікі, мігрантаў, але цікава выступаць і перад іўрыта-моўнымі слухачамі, бо ў маім рэпертуары ёсць сусветныя хіты на розных мовах: англійскай, французскай, італьянскай, іспанскай — гэты фармат заўсёды запатрабаваны. Я сумяшчала прафесіі спявачкі і вядучай мерапрыемстваў — сёлета вяла канцэрт «Рускай дыскатэкі», дзе выступалі вядомыя расійскія гурты: «Самацветы», «Ліцэй», «Дэма». Пабывала ў гасцях на радыё «Рэка», дзе адбыліся прэм'еры маіх песень ізраільскіх аўтараў, прычым, што цікава, вядучы быў вельмі добра знаёмы з Нацыянальным аркестрам імя І. Жыновіча, у якім я працавала 15 гадоў. Акрамя таго, я выкладаю вакал і фартэпіяна для дзяцей, маім вучням ад 3 гадоў і больш, цяпер заняткі з імі працягваем анлайн.

9 сакавіка ў Марыны адбыўся, як кажуць прымхлівыя артысты, «крайні» канцэрт, прысвечаны Міжнароднаму жаночаму дню. А з 15 сакавіка ўжо ўсе культурныя, спартыўныя, відовішчныя, наогул, любыя масавыя мерапрыемствы ў краіне былі адмененыя. Зачыніліся тэатры, музеі, гандлёвыя цэнтры, школы і дзіцячыя садкі, афіцыйныя ўстановы.

КАРАНЦІН І ШТРАФЫ

— На мой погляд, усё адбывалася імкліва: пасля футбольнага матча стала вядома, што адзін чалавек хворы на каранавірус, і тут жа ўсе, хто быў на тым матчы, сышлі ў двухтыднёвы каранцін — дарэчы, тут вельмі строга сочаць і правяраюць, каб чалавек знаходзіўся дома, а парушальнікаў караюць вялізным штрафам. (Памер штрафу складае, паводле «РІА Навіны», ад 500 да 5 тысяч шэкеляў, у эквіваленце гэта 140—1400 долараў ЗША. — **«Зв»**.)

На сёння, напрыклад, з дому можна выйсці на адлегласць максімум 100 метраў, каб прагуляцца, наведаць краму ці аптэку, пры гэтым неабходна вытрымліваць сацыяльную дыстанцыю ў 1,5-2 метры паміж людзьмі. Ад 12 красавіка абавязкова трэба насіць маску (выключэнні толькі для некалькіх катэгорый грамадзян, у тым ліку дзяцей да 6 гадоў).

З 8 да 15 красавіка ў Ізраілі адзначалі Песах, і ў першы і апошні дні свята ўрад абвясціў татальны каранцін — нельга было наогул пакідаць дом з трох гадзін дня да наступнай раніцы. Чаму такія жорсткія меры? Бо ізраільцяне традыцыйна святкуюць Песах, ходзячы ў госці адно да аднаго і гуляючы па вуліцы, і многіх не спынілі б паўмеры. Так што сустракалі свята перад камп'ютарам — па канферэнц-сувязі, віншавалі сяброў і сваякоў праз манітор.

СТАСУНКІ НА АДЛЕГЛАСЦІ

— Безумоўна, ратуюць сацыяльныя сеткі. Без іх наогул не ведаю, што было б, а так з сябрамі і роднымі можна падтрымліваць кантакт анлайн, дый з публікай таксама. На пачатку каранціна былі, дарэчы, трансляцыі і з установаў культуры — калі на сцэне выступаюць адзін-два чалавекі пры пустой зале, але ідзе трансляцыя на інтэрнэт-платформах. Цяпер у асноўным такія трансляцыі і прамыя ўключэнні артысты ладзяць з дому, бо няма сіл сядзець склаўшы рукі.

— Ці захапілі цябе распаўсюджаныя цяпер у сеціве флешмобы — «ІзаІзаляцыя», удзельнікі якой «ажыўляюць» вядомыя мастацкія палотны з сабой у галоўнай ролі, або спартыўныя чэленджы?

— Днямі ізраільскія дзеячы культуры, мастацтва і сферы забаў абвясцілі інтэрнэт-акцыю, у якой мне таксама прапанавалі ўдзельнічаць, — у сацыяльных сетках публікуем яркія фота «на рабочым месцы», з розных канцэртаў і шоу, каб падсілкаваць людзей у гэты няпросты час станоўчымі эмоцыямі. Таксама я пачала весці ў сваіх сацсетках прамыя эфіры: загадзя спытала, ці хочуць людзі, каб я для іх спявала, — атрымала большасць водгукаў, што так, безумоўна. Нават з улікам таго, што ў мяне прафесійнай апаратуры дома няма і што хатні інтэрнэт-сігнал няўстойлівы, — першы блін аказаўся не камяком, слухачы ўхваляюць ідэю і робяць замовы, што хацелі б пачуць.

Многія артысты лічаць, што і дома неабходна «трымаць сябе пры парадзе», але Марына гэтым не заклапочана: «Хоць і панакупляла шмат новых адценняў памады, але забылася ўжо, калі наносіла макіяж. Дый навошта, калі з дому можна выйсці толькі ў масцы і акулярах, каб абараніць вочы? Аднак бачу ў гэтым свае плюсы — скура адпачывае ад сцэнічнай касметыкі».

МЫЦЬ РУКІ І МАРЫЦЬ

— Я ўсё жыццё даволі часта мыю рукі, так што для мяне гэтае правіла ніякіх цяжкасцяў не выклікала. Спецыяльнага «рукамыйнага» рэпертуару не маю, — па голасе чуваць, што Марына ўсміхаецца, — аднак калі б раіла, то, безумоўна, сваю песню — «Грай, скрыпач».

— Многія, хто сядзіць у самаізаляцыі не першы тыдзень, дзеляцца марамі, што будуць рабіць, #каліўсёгэтаскончыцца. Што ты абавязкова зробіш, калі свет вернецца да больш-менш звыклага рытму жыцця?

— Я вельмі люблю мора і цяпер якраз жыву недалёка ад яго — можна дайсці пешшу. Але дайсці, сама разумееш, зараз ніяк не атрымаецца, і я вельмі сумую па такой магчымасці. Таму першае, што я зраблю, — пабягу на мора, якое і падсілкоўвае, і супакойвае, у якім бы стане і настроі ты ні знаходзіўся... А пакуль — застаюся дома.

Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота з асабістага архіва артысткі.

Культасвета

Пяць стагоддзяў духоўнасці

XVI Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні, прымеркаваныя да 500-годдзя заснавання Жыровіцкага манастыра і бібліятэкі, плануецца правесці ў Мінску 26—27 лістапада. Першапачаткова форум меў адбыцца яшчэ ў сярэдзіне мая, аднак у сувязі з пандэміяй каранавіруса ў свеце арганізатары — Міністэрства культуры і Нацыянальная бібліятэка Беларусі — перанеслі меркаваныя даты мерапрыемства на восень.

Як расказала «Звяздзе» **загадчык сектара навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Таццяна САПЕГА,** Міжнародныя кнігазнаўчыя чытанні, што аб'ядноўваюць даследчыкаў і спецыялістаў, якія займаюцца вывучэннем і папулярызацыяй кніжнай культуры, ужо даўно сталі адным з найважнейшых мерапрыемстваў у навуковым і культурным жыцці краіны. На сёння для ўдзелу ў канферэнцыі зарэгістраваліся каля 100 чалавек — гэта даследчыкі з Беларусі, Польшчы, Літвы, Украіны, Расіі, а таксама з Францыі. Сярод тэм, якія збіраюцца абмяркоўваць спецыялісты падчас чытанняў, — роля манастыроў як цэнтраў кніжнай культуры і асобна гісторыя, сучасны стан і перспектывы кніжнага збору Жыровіцкага манастыра; гістарычныя кніжныя калекцыі і бібліяграфічны ўлік кніжных помнікаў у нашай краіне; рукапісная кніжнасць Беларусі, развіццё айчынных тыпаграфій на працягу XVI—XVIII стагоддзяў; мастацкае афармленне рукапісных і друкаваных кніг; кніга ў сучасным сацыякультурным і інфармацыйным асяродку; роля асобы ў стварэнні і развіцці беларускага кнігазнаўства.

Каб далучыцца да ўдзельнікаў канферэнцыі, неабходна прайсці папярэднюю рэгістрацыю на партале бібліятэкі nlb.by — яна адкрытая дагэтуль. А вось прыём матэрыялаў, якія трапяць у выніковы зборнік форуму, ужо завершаны; арганізатары атрымалі больш за 50 арыгінальных артыкулаў навуковага і прыкладнога характару. «Безумоўна, канферэнцыя дасць магчымасць агучыць шматлікія навуковыя адкрыцці, якія датычацца гісторыі і культуры Жыровіцаў, а таксама ўнікальнай нацыянальнай святыні — абраза Жыровіцкай Маці Божай», — зазначае Таццяна Сапега. Дарэчы, нягледзячы на перанос міжнароднай навуковай канферэнцыі, арганізатары прынялі рашэнне падрыхтаваць і выдаць зборнік артыкулаў да 20 мая — цэнтральнай даты ўрачыстасцяў, калі штогод адзначаецца Дзень памяці Жыровіцкай Божай Маці. Зборнік стане значным навуковым і культурным унёскам да святкавання 550-годдзя здабыцця цудатворнай Жыровіцкай іконы Божай Маці і 500-годдзя з дня заснавання Свята-Успенскага Жыровіцкага мужчынскага манастыра.

Якія адкрыцці анансавалі ўдзельнікі будучых кнігазнаўчых чытанняў? Напрыклад, кандыдат філалагічных навук Сяргей Гаранін, намеснік дырэктара Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, вывучаў старажытныя паданні па пісьмовых крыніцах. На працягу старажытнага перыяду гісторыі ў Жыровіцкім манастыры склалася мноства паданняў пра цуды, што адбыліся ад абраза Жыровіцкай Маці Божай. Гэтыя паданні ўяўляюць сабою асаблівы жанр старажытнабеларускай літаратуры, не даследаваны да цяперашняга часу. Навуковец сцвярджае, што стварэнне апавяданняў пра цуды ў Жыровіцкім манастыры не спынілася пасля завяршэння старажытнай эпохі гісторыі, а працягвалася ў XIX, XX стагоддзях і адбываецца ў наш час. А навуковы супрацоўнік Веткаўскага музея стараверства і беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава Галіна Нячаева даследавала рукапісы канца XVII — пачатку XVIII стагоддзя ў бібліятэках Масквы і Санкт-Пецярбурга і выявіла там матэрыялы па гісторыі Жыровіцкага абраза: тэксты, гравюры і мініяцюры з яго выявай. Навуковы супрацоўнік Інстытута рукапісу Нацыянальнай бібліятэкі Украіны імя У. І. Вярнадскага кандыдат гістарычных навук Таццяна Дабранская займаецца пільным вывучэннем вядомага рукапіснага беларускага помніка XVII ст. — Ірмалагіёна (Жыровіцкага). Даследчыца крытычна перагледзела звесткі апісанняў і плануе падзяліцца з удзельнікамі міжнародных кнігазнаўчых чытанняў новымі вынікамі датавання рукапісу.

❍ ТЫМ ЧАСАМ

Адмыслова да юбілею Свята-Успенскі Жыровіцкі манастыр пашырыў сваю прысутнасць у інтэрнэт-прасторы і запусціў афіцыйны YouTube-канал «Да 500-годдзя Жыровіцкага манастыра». На сёння тут змешчаныя інфармацыйныя сюжэты пра падрыхтоўку да ўрачыстасцяў, відэафільмы пра гісторыю абіцелі, Мінскай духоўнай семінарыі і іх сучаснае жыццё, а таксама расказы пра святы і богаслужэнні, інтэрв'ю з насельнікамі манастыра, відэапаштоўкі з прыгожымі краявідамі Жыровіцаў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

«ПЕРАЧЫТАЛА ШМАТ КНІГ...»

Хтосьці з беларусаў пайшоў на самаізаляцыю, хтосьці жыве як раней

Ці змянілася нешта ў нашым жыцці з прыходам каранавіруса? Як мы сталі рэагаваць на новыя рэаліі, чаго баімся, на што спадзяёмся? Мы пагаварылі з некалькімі пажылымі беларускамі з розных куткоў краіны. Вось іх адказы.

Людміла КАРНЕЕВА (62 гады), Магілёў:

Я з пачатку сакавіка пайшла на самаізаляцыю. Не тое, што я ўвесь час сяджу дома, але стараюся не выходзіць лішні раз у краму, не хаджу ні ў музеі, ні на масавыя мерапрыемствы. А раней я часта хадзіла на адкрыццё выставак, на прэзентацыі кніг, займалася на розных курсах — мела актыўны лад жыцця. Адзіны раз, калі я парушыла самаізаляцыю, — гэта ўчора прыехала да бацькі ў Брэсцкую вобласць, вось я зараз у яго. Яму 86 гадоў, і ён чакаў мяне. Сёння займалася ўборкай. Я пакуль першыя некалькі дзён не хачу з ім асабліва блізка кантактаваць з меркаванняў бяспекі. Мы ў розных пакоях — добра, што дом вялікі. Пакуль нават за адным сталом не ядзім. Ці мала што, я ж учора ехала ў маршрутцы з 17 чалавекамі. Праўда, ніхто не чхаў і не кашляў, ніхто асабліва не размаўляў, таму спадзяюся, што ўсё будзе добра.

Я за гэтыя паўтара месяца самаізаляцыі ў Магілёве перачытала шмат кніг. Тут, у вёсцы, таксама працягну чытаць — у таты вялікая бібліятэка. І ў тэлефоне ў мяне безлімітны інтэрнэт. Наогул гэта мая малая радзіма, я тут усіх ведаю, і мяне ведаюць. Калі б гэта быў звычайны час, я б пахадзіла, паездзіла па знаёмых бабулях, але пакуль, мабыць, буду мець зносіны з імі толькі па тэлефоне. Нічога, пабачымся потым, калі ўсё скончыцца.

Раіса ЗЕЛЯНІЦКАЯ (70 гадоў), Барселона:

Я ўжо два месяцы як у Барселоне. Прыляцела сюды да дачкі 15 лютага, калі яшчэ ніхто ні ў нас, ні ў Еўропе не думаў ні пра якую эпідэмію. Праўда, сын мой мне казаў: «Дарма ты ляціш». І я цяпер шкадую, што не паслухалася яго. Дадому, у Беларусь, я павінна была вярнуцца 14 сакавіка, але рэйс адмянілі. Грошы за білет да гэтага часу не вярнулі. 25 красавіка я зраблю другую спробу: ужо купіла білет, гэтым разам на «Белавія». Так што, калі рэйс не адменяць, прылячу.

Тут мы ўсе сядзім у ізаляцыі. Каранцін у Іспаніі працягнулі да 25 красавіка, хоць хваля захварэлых ужо некалькі дзён як пайшла на спад. Вуліцы ў горадзе цалкам пустыя. Выходзіць можна толькі ў найбліжэйшы магазін, аднаму чалавеку ад сям'і, і тое толькі раз на тыдзень. Але я ўчора выйшла паціху і трошачкі прайшлася. Праўда, праз 10 хвілін да мяне пад'ехала паліцэйская машына, і паліцэйскія нешта пачалі мне тлумачыць, не выходзячы з машыны. Я паківала галавою, маўляў, зараз вярнуся дадому, і яны з'ехалі. Штрафаваць мяне не сталі, хоць за парушэнне каранціну тут звычайна штрафуюць. Выходзіць можна, толькі калі ты едзеш на работу, але ў такім выпадку ў цябе будзе даведка — дазвол на выхад.

Наогул іспанцы вельмі бесшабашныя, любяць патусавацца, схадзіць у кавярню, рэстаран, на пляж. І спачатку яны ўспрынялі эпідэмію несур'ёзна. Але потым пайшла інфармацыя па ўсіх каналах, на тэлефон сталі прыходзіць папярэджанні, і людзі сталі задумвацца аб сваіх паводзінах, перасталі выходзіць з дому.

Але цяпер тут «прачнуліся» рознага роду ашуканцы, таму ўсе паведамленні на тэлефоне і ў інтэрнэце трэба старанна фільтраваць. Масак у аптэках няма. У мяне скончылася медстрахоўка, яна была толькі на месяц. У дачкі няма ніякіх накапленняў, яна жыве ад зарплаты і да зарплаты, у мяне грошы, што я з сабой узяла, таксама амаль скончыліся... Але я заняла пазіцыю — не ўнікаць у дрэнную інфармацыю, не чапляць яе на сябе. Гляджу фільмы ў у тэлефоне. Сумна, вядома. У дачкі ёсць па томіку Пушкіна, Чэхава і Акуніна на рускай мове. Я іх ужо перачытала. Хацела купіць крыжаванкі ў краме, але іх усе раскупілі...

Я за сябе не баюся — чамусьці ўпэўненая, што да мяне вірус не прычэпіцца. Але я хвалююся за сваіх дзяцей і за ўнукаў.

Галіна КРОТ (75 гадоў), Жыткавічы:

Мы як жылі, так і жывём. Унука вось прывезлі нам на канікулы з Мінска... Мне здаецца, цяпер куды больш панікі, чым самога каранавіруса. Вядома, чуткі розныя ходзяць: адзін кажа адно, другі — другое... Але я лічу, што не так ужо ўсё і страшна. Сярод маіх знаёмых ніхто не захварэў, ды і мы з мужам нармальна трымаемся. Спецыяльна сваім здароўем мы не займаемся, проста я лічу, што трэба больш рухацца, тады і здароўе будзе. А як сядзеш, так і пачынаеш толькі прыслухоўвацца да сваіх адчуванняў.

Мы з мужам цяпер якраз робім дома рамонт, так што вельмі занятыя. Раней хадзілі на рэпетыцыі ў Дом культуры і ў Тэрытарыяльны цэнтр сацабслугоўвання — мы спяваем у ансамблі. Цяпер рэпетыцыі часова адменены з-за эпідэміі. Але як толькі адновяцца — зноў пойдзем.

Таццяна КОЛБІНА (65 гадоў), Мінск:

Я ўжо тры тыдні як абмежавала ўсе свае перамяшчэнні па горадзе і нават па сваім мікрараёне. Хоць я заўсёды была вельмі актыўная пенсіянерка. Займалася ва Універсітэце трэцяга ўзросту, сама праводзіла майстар-класы, на якіх вучыла рабіць упрыгажэнні і карціны з натуральнай скуры, хадзіла ў басейн, на фітнес. Але цяпер усё адмяніла.

Такой самаізаляцыі, каб наогул не выходзіць з кватэры, я не прытрымліваюся. Пашыла сабе маскі і выходжу, напрыклад, у краму, але ўсяго пару разоў на тыдзень і ў той час, калі там менш народу. Добра, што ў мяне ёсць сабака, які цяпер мяне «выгульвае» два, а то і тры разы на дзень. Пры гэтым я стараюся шпацыраваць з ім у месцах, дзе амаль няма людзей. На шчасце, такія ёсць у маім мікрараёне.

А дома я заўсёды знайду, чым сябе заняць. Чытаю, займаюся шыццём, гляджу ў інтэрнэце віртуальныя выстаўкі, тэатральныя пастаноўкі, канцэрты. З сяброўкамі цяпер маю зносіны па тэлефоне.

У мяне вялікі круг знаёмых, сярод іх ёсць і адзінокія людзі. І я вось думаю, як ім цяпер, асабліва калі ў чалавека ўжо зрок няважны і ён не можа ні чытаць, ні вязаць. Думаю, іх гэта вельмі прыгнятае — тое, што цяпер адбываецца.

На шчасце, у маім асяроддзі няма ніводнага чалавека, які б пацярпеў ад каранавіруса. І я аптымістка па натуры, але ўсё роўна трохі турбуюся, нават не пра сябе, а пра дзяцей. Мяне маёй пенсіі ніхто не пазбавіць, якая б яна ні была, а вось як складзецца ў іх далей з работай?

Гутарыла Святлана БУСЬКО.

Рух ад сэрца

Фантастычныя хлопцы і дзяўчаты

І БЕСКАРЫСЛІВЫЯ СПРАВЫ ІХ РУК

Валанцёры БДУІР арганізавалі дапамогу пажылым і адзінокім людзям у перыяд распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі. Добраахвотнікі разносяць па дамах прадукты, тавары першай неабходнасці і лекі.

У акцыі бярэ ўдзел больш за 40 чалавек. Перад работай кожны валанцёр прайшоў інструктаж. Студэнты абышлі Савецкі раён сталіцы і распаўсюдзілі сярод людзей ва ўзросце інфармацыю, якім чынам можна атрымаць дапамогу. Сацыяльны цэнтр таксама штодня дае валанцёрам па сем-восем новых адрасоў.

— У нашым валанцёрскім цэнтры БДУІР — проста фантастычныя хлопцы і дзяўчаты! Кожны дзень яны самаддана гатовы дапамагаць людзям, — расказала куратар валанцёраў Алена ГАЛАВАНЬ. — Бывае, пажылы чалавек жыве ў Зялёным Лузе, а патрэбныя яму лекі ёсць толькі ў аптэцы на другім канцы горада. Валанцёры ніколі не адмаўляюць!

Самім добраахвотнікам дапамагаюць БРСМ і студэнцкі прафкам БДУІР: яны выдзелілі пальчаткі, маскі, антысептыкі.

— Калі я прыязджаў дадому, у Навагрудак, перш за ўсё ішоў да сваёй бабулі дапамагаць. Ёй споўнілася 82 гады, але, на жаль, я не змог павіншаваць яе асабіста ў сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй у краіне, — падзяліўся студэнт трэцяга курса факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання Раман ШАБАНОВІЧ. — Я добра знаёмы з цяжкасцямі, якія ўзнікаюць у людзей сталага веку, і таму хачу ім дапамагчы.

Студэнтка першага курса інжынерна-эканамічнага факультэта Сняжана ЛІСОЎСКАЯ актыўна ўдзельнічае ў валанцёрскім руху з таго моманту, як паступіла ва ўніверсітэт. Яна расказала пра цяжкасці, з якімі сутыкаюцца валанцёры. Бывае, складана трапіць у кватэру з-за зламанага дамафона альбо заказы аказваюцца занадта вялікія, каб іх мог даставіць адзін чалавек. Аднак дзякуючы згуртаванасці і падтрымцы іншых добраахвотнікаў праблемы вырашаюцца вельмі хутка.

— Для нас, валанцёраў, вельмі важная гэтая работа, таму што мы хочам зрабіць свет хоць крышачку лепшым. Мы думаем, што, здзяйсняючы добрыя справы, паказваем прыклад іншым: калі ты можаш паклапаціцца пра тых людзей, якім патрабуецца твая дапамога, то зрабі гэта, — падкрэсліла дзяўчына.

Кожны можа далучыцца да добраахвотнікаў! Для гэтага дастаткова звярнуцца ў валанцёрскі цэнтр БДУІР або напісаць у іх групу «УКантакце».

Падрыхтавана прэс-службай БДУІР.
Фота валанцёрскага цэнтра ВНУ.

Новыя кнігі

Бліжэй да чытача

ААТ «Белкніга» анансавала адкрыццё новай крамы. Кнігарня, якая 23 красавіка адчыніць свае дзверы ў Калінкавічах на вуліцы Кастрычніцкай, 45а/2, стане 12-й крамай кнігагандлёвай сеткі на Гомельшчыне і 89-й — у краіне.

«Нават у такія няпростыя часы наша кампанія працягвае работу па папулярызацыі беларускай кнігі і чытання ў цэлым, стараецца зрабіць кнігу дасяжнай ва ўсіх кутках нашай краіны», — зазначае адміністрацыя «Белкнігі» ў звароце да пакупнікоў. Дарэчы, у дзень адкрыцця ім усім прапануюць 10-працэнтную зніжку не толькі на кнігі беларускіх і расійскіх выдаўцоў, але і на канцылярскія тавары, папяровую прадукцыю і іншы асартымент.

Вікторыя ЗАХАРАВА.
Фота belkniga.by.

Жыровіцкі манастыр: энцыклапедычнае прачытанне

«Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» падрыхтавала да выдання энцыклапедычны даведнік, прысвечаны гісторыі Жыровіцкага Успенскага манастыра, абразу Жыровіцкай Маці Божай, а таксама паселішчу Жыровіцы Слонімскага раёна.

Праект, які ўклаў кандыдат багаслоўя, дацэнт, прарэктар Мінскай духоўнай семінарыі А. В. Слесараў, прысвечаны 550-годдзю з'яўлення ўнікальнай нацыянальнай, праваслаўнай святыні — абраза Жыровіцкай Маці Божай. Гэтая рэліквія прызнана і праваслаўнай, і каталіцкай канфесіямі цудатворнай хрысціянскай святыняй.

У энцыклапедычнае выданне, якое выйдзе накладам 1000 экзэмпляраў, уваходзіць болей за 200 энцыклапедычных артыкулаў. Сярод аўтараў даведніка — намеснік Жыровіцкага манастыра, рэктар Мінскай духоўнай семінарыі М. П. Альпак (архіепіскап Навагрудскі і Слонімскі Гурый), першы прарэктар Мінскай духоўнай семінарыі Ю. М. Сакалоў (іераманах Афанасій), свяшчэннік, прафесар Мінскай духоўнай семінарыі Г. Э. Шчаглоў, дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Г. А. Лаўрэцкі, протадыякан, выкладчык Мінскай духоўнай акадэміі і Мінскай духоўнай семінарыі П. У. Бубнаў.

Сяргей ШЫЧКО.